*бруск-* (са стратай беглага *о*) прыводзіць да ўтварэння прыметніка *брусчаты;* параўн. *каробчаты (каробка), трубчаты (трубка), складчаты (складка), сетчаты (сетка), рашотчаты (рашотка)* і пад. У словах гэтага словаўтваральнага тыпу магчыма і іншае чляненне: *труб-чат-ы* (ад *труб-а), ступень-чат-ы* (ад *ступень*) і пад., дзе вылучаецца не суфікс *-ат-*, а суфікс *-чат-*. Гэты суфікс набывае актыўнасць, і толькі яго можна бачыць, напрыклад, у слове *сустаўчаты.* Такім чынам, і ў гэтым выпадку знайсці падставы для апраўдання перадачы чаргавання *ск* з *шч* немагчыма, таму што *с* і *к* ва ўтваральнай аснове (*брусок — бруск-*) знаходзяцца не ў складзе каранёвай марфемы, а па розныя бакі марфемнага шва.

Ніякай аналогіі з напісаннямі тыпу *пішчык* (ад *пішчаць*), *вашчына* прыметнікі *пясчаны, брусчаты* не маюць, акрамя хіба таго, што і там, і тут аднолькава вымаўляецца *шч.* Але ж тады аналогія паміж словамі *пішчык* (ад *пішчаць*) і *перапісчык* (ад *перапісваць*) — яшчэ большая, і тым не менш мы працягваем пісаць *перапісчык,* а не *перапішчык,* і гэта напісанне ніякіх цяжкасцей у школе не выклікае.

Зробім выснову: замяняць напісанні *пясчаны, пясчанік, брусчаты, брусчатка* і пад. на напісанні *пяшчаны, пяшчанік, брушчаты, брушчатка* і пад. немэтазгодна, таму што, па-першае, трэба было б рабіць дадатковае выключэнне з існуючых правіл (а кожнае дадатковае выключэнне ніяк не спрыяе паляпшэнню правапісу!), а па-другое, гэта выключэнне расхіствала б марфалагічны прынцып, які з'яўляецца асноўным і пераважаючым у правапісе зычных.

Г. В ГАВАРОЎСКІ

## СЕМАНТЫЧНАЯ СУАДНОСНАСЦЬ ЯКАСНЫХ ПРЫСЛОЎЯЎ З ЯКАСНЫМІ ПРЫМЕТНІКАМІ

Якасныя прыслоўі на *-а* — найбольш багатая лексіка-граматычная група слоў у сістэме прыслоўяў. Яны адносна лёгка і хутка папаўняюцца новымі вытворнымі ад якасных прыметнікаў. У сувязі з гэтым лексічнае значэнне кожнага такога прыслоўя выводзіцца з лексічнага значэння адпаведнага прыметніка. Аднак валодаючы ўласнай семантыкай, якасныя прыслоўі не могуць уступаць у сінтаксічныя адносіны з назоўнікамі ні атрыбутыўна, ні прэдыкатыўна, дакладней, яны не спалучаюцца з назоўнікамі. Гэта прыводзіць да таго, што прыметнікі і прыслоўі ўжываюцца толькі ва ўзаемнавыключальных сінтаксічных умовах. Такім чынам, якасныя прыслоўі і прыметнікі аказваюцца вельмі блізкімі па будове і семантыцы, але процістаўлены сінтаксічна. Такая з'ява рэдкая і выключная для слоў, якія належаць да розных часцін мовы, і як бы нагадвае суадноснасць сінтаксічных форм словазмянення.

Семантыка прыслоўяў і суадноснасць яе з семантыкай базавых прыметнікаў, па сутнасці, не былі прадметам спецыяльнага разгляду. Пацвярджэннем таму можа служыць праца Г. А. Клычкова, якая спецыяльна прысвечана полісеміі розных часцін мовы і семантычнай суадноснасці іх асобных слоў, у якой, аднак, з разгляду выключаюцца прыслоўі[1]. Супастаўленне ж сэнсавых структур суадпаведных прыметнікаў і прыслоўяў паказвае, што паміж імі існуюць рознабаковыя семантычныя адносіны, хоць значэнне прыслоўя і вызначаецца значэннем прыметніка. Так, напрыклад, ТСБМ прыслоўе *вільготна* падаецца наступным чынам: «1. Прысл. да **вільготны**. 2. безас. ў знач. вык. Пра наяўнасць **вільгаці**, сырасці. У лесе стала больш глуха, ціха і **вільготна** (Колас)». Такім чынам, значэнне прыслоўя *вільготна* раскрываецца праз значэнне адпаведнага прыметніка *вільготны, -ая, -ае;* які так тлумачыцца: «1. Насычаны, пакрыты **вільгаццю**; мокры. Плуг шуршэў пад скібаю, раскідаў **вільготную** зямлю на крыгі-кавалкі (Баранавых). — Мне цёпла, — адказаў хлапец і, зняўшы вушанку, прыгладзіў **вільготны** чуб (Кулакоўскі). // У якім залішне многа **вільгаці**; сыры. **Вільготны** склеп. **Вільготны** клімат. Нізкая **вільготная** мясцовасць змянілася ўзвышанай (В. Вольскі)». Тут мы маем, па сутнасці, паўтор семы ў адным і другім слове. Такая ж з'ява назіраецца даволі часта пры

тлумачэнні якасных прыслоўяў, але не заўсёды прыслоўе паўтарае поўны аб'ём семантыкі прыметніка. Напрыклад, прыметнік *вольны, -ая, -ае; -лен, -льна* ў ТСБМ мае дванаццаць значэнняў: «1. Нікому не падпарадкаваны, ні ад кога не залежны, які мае магчымасць адвольна распараджацца сваім часам, ажыццяўляць свае жаданні. Каля мяне, як цень, Праходзіць да вадапою **Вольны** лясны алень (Караткевіч). // Выпушчаны на волю. – Быў палонны, а цяпер **вольны**, – казаў... (Васілёк), едучы побач (Маўр). // Які вызваліўся ад якіх-н. абавязкаў. Спектакль павінен быў адбыцца ў нядзелю, калі ўсе суседзі **вольныя** ад працы (Бядуля). // Не заняты ніякай работай, які мае час. (Волька:) Вера то ўжо скончыла заняткі ў сваёй школе, цэлае лета будзе **вольная** (Чорны). // Які мае права, магчымасць дзейнічаць па ўласнаму жаданню. **Вольны** ўсюды я ляцець (Колас). 2. Свабодны ад сацыяльнага і іншага прыгнёту. **Вольная** праца. **Вольнае** жыццё. **Вольным** народам сталі вы сёння (Колас). 3. Нікім, нічым не заняты; пусты, свабодны. Яўхім знайшоў каля століка ў кутку два **вольныя** зашмальцаваныя крэслы (Мележ). // Нікім не замешчаны, вакантны. **Вольная** пасада. // Нічым не заняты (пра час). Кожную **вольную** хвіліну Люба бралася за кніжку (Васілевіч). 4. Не абмежаваны якімі-н. перашкодамі, прадметамі, бязмежны, бяскрайні. **Волен** свет мне кругом (Колас). // Які знаходзіцца на свабодзе, не запёрты ў што-н.; нічым не абмежаваны. Вунь ля гаспадарскіх тлустых качак Села **вольных** птахаў чарада (Сербантовіч). // Пра неабмежаваны нічым рух, неабмежаванае пашырэнне. Даўшы хвалям **вольны** ход. Прыпадыме бацька Нёман На хрыбце магутны лёд (Багдановіч). 5. Нястрыманы, які выходзіць за межы прынятых нормаў. **Вольныя** жарты. **Вольнае** абыходжанне. // З якога знята абмежаванне, дазволены законам. **Вольны** продаж сельскагаспадарчых прадуктаў. 6. Уласцівы свабоднаму жыццю. Льецца ў полі песня **вольная** На вясновай паласе (Бядуля). 7. Які заклікае, абуджае імкненне да волі; свабодалюбны. **Вольнае** слова. **Вольная** думка, натура. 8. Больш чым дастатковы па велічыні, прасторны. **Вольны** касцюм. 9. Які робіцца без выкарыстання спартыўных прылад. **Вольныя** рухі, практыкаванні. 10. Які адбываецца на свабодзе, не ў памяшканні, не пад наглядам. **Вольная** злучка. **Вольнае** ўтрыманне жывёлы. 11. У якім не прытрымліваюцца пэўнага парадку. Людзі рухаліся **вольнымі** шарэнгамі. 12. Не заціснуты, не замацаваны ў чым-н. **Вольны** канец вяроўкі». Прыслоўе ж *вольна* фіксуецца толькі са значэннямі: «1. Прысл. да **вольны** (у 1, 2, 4, 5, 6, 8, 10 знач.). 2. Каманда на права трымацца ў страі свабодна. Стаяць **вольна**! – **Вольна**! – скамандаваў ён (Ягораў). Байцы ўскалыхнуліся, ім перадалося хваляванне камандзіра (Крайчанка). 3. Безас. у знач. вык. Аб адчуванні свабоды. Тут так **вольна**, так цікава, Што толькі тут ён і жыве (Колас). Прыслоўе *высока:* «1. Прысл. да **высокі**. 2. У знач. вык. Аб вялікай адлегласці ўверх. Сонца было ўжо **высока**, калі Віця выйшаў з хаты (Чарнышэвіч); не здольна мець сем значэнняў прыметніка *высокі, -ая, -ае.* 1. Працяглы знізу ўверх; процiл. нізкі. **Высокі** дом. Над намі шушукаюцца **высокія** гордыя хвоі (Бядуля). // Які знаходзіцца на значнай вышыні над узроўнем мора. **Высокая** мясцовасць. **Высокія** горы. 2. Значна большы за сярэднюю норму. **Высокія** тэмпы развіцця. **Высокі** ўраджай. **Высокая** тэмпература. Напярэдадні майскага свята механічны цэх... узяў самыя высокія абавязацельствы (Шыцік). 3. Добры па якасці; выдатны. **Высокае** майстэрства. **Высокая** культура. **Высокая** тэхніка. 4. Выдатны па свайму значэнню, вельмі важны; пачэсны, шаноўны. **Высокая** ўзнагарода, пасада. **Высокі** гонар. **Высокі** госць. 5. Поўны глыбокага значэння, незвычайны па свайму зместу. **Высокія** ідэі. **Высокая** мэта. Напоўнены сэрцы Пачуццём **высокім**; Нас гордасць шугае Патокам глыбокім (Колас). 6. Вытанчаны, рафінаваны. **Высокае** мастацтва. **Высокая** культура. 7. Тонкі, рэзкі (пра гукі). **Высокі** голас. **Высокая** нота. З дынаміка пачуліся перарывістыя гукі: то **высокія**, то нізкія (Шыцік). З кузні ляцеў звон сухі, **высокі** (Пташнікаў)».

Шэраг прыслоўяў, якія ўжываюцца ў сучасных тэкстах, ТСБМ з-за нейкіх прычын не зафіксаваў. Некаторыя з іх адзначаны ў іншых беларускіх слоўніках. Так, толькі на літару А ў «Слоўніку беларускай мовы» (Мн., 1987) дадаткова пададзена, у параўнанні з ТСБМ, яшчэ 58

якасных прыслоўяў: *абачліва, абаяльна, абдумана, аб'ектыўна, абмежавана, абразліва, абрывіста, абстрактна, абсурдна, абыходліва, абыякава, агідна, агніста, адвечна, аддана, адказна, адметна, адмоўна, адмыслова, адхоніста, адчувальна* і інш. Усе яны маюць суадносныя якасныя прыметнікі. Назіранні паказваюць, што паміж гэтымі суадноснымі прыслоўямі і прыметнікамі выяўляюцца ўвогуле ж падобныя семантычныя сувязі. Параўн., напрыклад: Кандрат зразумеў, што пакрыўдзілі і яго. І зусім не Андрэй. Схапіў брата загрудкі, кінуў цераз нагу на салому. – Ты? З ёю? Прыціснуў ў кут. – З ёю, – **адважна** адказаў Паўлюк (У. Караткевіч). – Пойдзеш ты ў свет і людзі Хадою **адважнай**, Прад табою слацца будзе Край наш неабсяжны (Я. Купала); Нехта **асцярожна** ўзяў яго за плячо (У. Караткевіч) – Старая не спала ад болю ў нагах, і **асцярожны** стук у шыбу не разбудзіў яе, а проста спалохаў (Я. Брыль); З усмешкай **вінавата** Папрасіла прабачыць і паклон зрабіла **міла** (А. Міцкевіч) – Ліда спадылба **вінаватым** позіркам глядзіць на брата (А. Пальчэўскі); У мяне... не выходзіла з галавы прыгожая дзяўчына з **мілымі** вачыма (М. Нікановіч); – Няхай **нятленна** Жыве ўспамін аб ім як чалавеку! (А. Міцкевіч) – Літаратурны твор – гэта не толькі праўдзівы дакумент эпохі, а такім ён павінен быць абавязкова, але і **нятленны** помнік мастацтва (У. Юрэвіч); – Ён вырашыў служыць, але славалюбна, аддана, **уедліва** (У. Караткевіч) – З Тамарай стаў праседжваць вечары над кнігамі і бацька... учэпісты, **уедлівы** (Я. Ермаловіч). Хоць значэнне прыслоўя і вызначаецца значэннем утваральнага прыметніка, разам з тым неабходна адзначыць, што не любое якаснае значэнне прыметніка можа ўзнаўляцца прыслоўем. «Спрацоўваюць» абмежаванні з сферы семантычнай спалучальнасці, дакладней, такія сэнсавыя прыметы, якія не сумяшчаюцца з катэгарыяльным значэннем дзеяння, прымету якога прыслоўе выражае. Словаўтваральныя карэляты тыпу *адважны — адважна, асцярожны — асцярожна, вільготны —вільготна, вольны —вольна, высокі — высока, мілы — міла, нятленны —нятленна, уедлівы — уедліва* і пад. вызначаюцца рознымі катэгарыяльна-граматычнымі значэннямі[2], таму такія словаўтваральныя пары адносяць да з'яў сінтаксічнай дэрывацыі, пад якой часта разумеецца ўтварэнне аднакарэнных слоў, якія маюць блізкае лексічнае значэнне, але адносяцца да розных часцін мовы. Аднак вядома, што пытанне аб тоеснасці лексічнай семантыкі роднасных слоў розных часцін мовы вырашаецца неадназначна. Калі ўлічыць, што катэгарыяльнае значэнне складае аснову лексічнага і абстрагуецца ад апошняга, то трэба будзе прыняць, што блізкасць лексічнай семантыкі аднакарэнных слоў розных часцін мовы не можа азначаць іх тоеснасці[3]. У сувязі з гэтым асобнага разгляду патрабуюць такія выпадкі, калі прыслоўі набываюць новыя ў параўнанні з базавымі прыметнікамі значэнні. Выпадкі такія параўнальна нешматлікія.

Супастаўленне новых значэнняў з тымі, якія набываюць прыслоўі ў параўнанні з семантыкай базавых прыметнікаў, выяўляе, што змест прыслоўя вызначаецца не рэчавым, а яго катэгарыяльным кампанентам значэння. Так, тыповым для гэтых значэнняў з'яўляецца такое, якое служыць для выражэння ступені прыметы дзеяння (параўн., напрыклад, прыслоўе *здорава* са значэннем 'вельмі, гулка, моцна': « – І **здорава** ж бухаюць гарматы, – ціха прамовіў Раман і сам сабе паківаў галавою (Колас). Асабліва **здорава**, зусім па-хатняму, пахла ў зямлянцы цыбуля (Брыль); разм. са знач. 'добра, умела, па-майстэрску': Зроблена **здорава**; з прыметнікам *здаровы, -ая, -ае; здароў, здарова,* які ўжываецца ў пяці значэннях: 1. Які мае добрае здароўе; проціл. хворы. – Можаце лічыць сябе амаль **здаровым**, таварыш Васілец. На твары слядоў ад апёку ўжо і цяпер амаль не відаць (Мележ). // У знач. наз. здаровы, -ага, м.; здаровая, -ай, ж. Пра чалавека. Аграном глядзеў на... (Крушынскага) з той нялоўкасцю, з якой – заўсёды хворы глядзіць на **здаровага** (Бядуля). // Непашкоджаны, які правільна дзейнічае (пра органы і часткі цела). Ужо як уязджалі ў шпітальны двор, ранены Зыгмунт Асядовіч пачаў стукаць **здаровую** рукою ў шкляное акенца да шафёра (Чорны). // Які выражае здароўе, уласцівы здароваму чалавеку. **Здаровы** выгляд. **Здаровы** смех. // Прыгодны, не папсаваны. Хто першы клаў грэблі на балотах, ніводзін чалавек ў Лонве ўжо не скажа. Кладкі пасля масціліся

адна на адну: новая на старую, здаровая на гнілую, спарахнелую ў балоце і высахлую на сонцы (Пташнікаў). // Перан. Разважлівы, разумны. Галовы ў нас **здаровыя**, рукі дужыя, сцяг навукі можам моцна трымаць (Крапіва). 2. Карысны для здароўя. **Здаровае** надвор'е. **Здаровае** харчаванне. 3. Разм. Моцнага целаскладу; дужы. **Здаровыя**, ружатварыя адзін у адзін, гвардзейцы выглядалі спакойнымі (Гартны). 4. Разм. Вялікі, моцны (пра з'явы, прадметы і пад.). Ян Гузік нагнуўся і падняў з зямлі **здаровы** кавалак жалеза (Гартны). 5. У знач. выкл. здароў (здарова)! Разм. (Верхаводка:) **Здарова**, Марына, **здарова**! (Марына:) А, **здароў**, Пецця, **здароў**! (Кучар)». Як відаць з прыкладаў, ніводнае значэнне гэтага прыметніка не суадносіцца са значэннем адпаведнага прыслоўя.

Да спецыфічна прыслоўных значэнняў адносяцца такія, якія даюць ацэнку дзеянню: станоўчую ці адмоўную. Гэта, напрыклад, словы *абуральна* 'дрэнна, агідна'; *блізка* ў значэнні 'зусім няма, адсутнасць'; *гладка* 'лёгка, без цяжкасцей, добра'; На ўсю з'ездаўскую залу **абуральна** і істэрычна крычала ў мікрафон Каракіна (М. Замскі); Сімон, які ведаў, што важных дакументаў і **блізка** няма, цяжка ўздыхнуў (Э. Самуйлёнак); Сумуе Несцярэнка, калі менш становіцца цяжкасцей, калі ўсё ідзе **гладка** (А. Міронычык); Спектакль прайшоў **гладка**; Мы **блізка** знаёмыя.

У шэрагу выпадкаў новыя прыслоўныя значэнні набываюць якасны характар. Напрыклад, *дзіка* 'са страхам, спужана', *дорага* 'цаной вялікіх намаганняў, цяжкасцей, ахвяр': — Зараз загарыцца наш дом, — сказала Марына, **дзіка** азіраючыся (К. Чорны); Хачу я, каб нашчадкі не забывалі, што нам свабода дасталася **дорага** (Ю. Свірка); Фон Адлер спыніў атакі — надта **дорага** яны каштавалі (І. Шамякін).

У цэлым семантычная структура адназначных і мнагазначных ад'ектыўных прыслоўяў фарміруецца асноўнымі значэннямі адназначных і мнагазначных прыметнікаў. Прыслоўі, з'яўляючыся самастойным лексіка-граматычным разрадам слоў, набываюць і выражаюць прыметы дзеяння. Гэта пераважна якасныя прыметы. У нязначнай колькасці гэтыя прыметы могуць быць прасторавымі, часавымі, узмацняльнымі: *блізка, бойка, вечна, высока, далёка* і інш. Такім чынам, у прыслоўяў вылучаюцца, галоўным чынам, значэнні іх утваральных прыметнікаў, якія знаходзяцца ў розных адносінах да асноўных значэнняў вытворных прыслоўяў.

Сярод фактараў, якія ўплываюць на магчымасць утварэння якасных прыслоўяў, трэба назваць асаблівасць рэчыўнага значэння базавых прыметнікаў. Гэтая ўмова асабліва характэрная для такой сітуацыі, калі прыметнік, які вызначаецца непаўнатой якаснага значэння, наогул не здольны ўтвараць прыслоўе: *гарысты, глебавы, гузаваты, зямлісты, касцісты, кашчавы, перысты, узгорысты* і інш. Хаця побач са словамі ўказанага тыпу трапляюць і такія, якія здольны мець прыслоўныя ўтварэнні: *вінаваты — вінавата, яршысты — яршыста*.

У асобных выпадках у прыслоўяў не ўзнаўляюцца такія значэнні прыметнікаў, якія называюць прыметы, уласцівыя жывым істотам: *віхрасты, вушасты, галінасты, губасты, скуласты*. Прычына адсутнасці прыслоўных дэрыватаў ад гэтых прыметнікаў у лексічным значэнні прыслоўяў, у тых сэнсавых адценнях, якія перашкаджаюць ім спалучацца нават з тымі семантычнымі разрадамі назоўнікаў, з якімі магчыма спалучэнне прыслоўяў (параўн., *цэгла старчаком, валасы вожыкам, яйцо усмятку, укрутую*). Прадмет жа нашага даследавання — прыслоўі з фінальным *-а*. Так, дзеянне не можа мець некаторых характарыстык, напрыклад, узроставых і некаторых прасторавых. Таму прыметнікі тыпу *вялікі, новы, гуляшчы, лядашчы* і пад. не здольны стаць базай для ўтварэння прыслоўяў на *-а*.

З другога боку, лексічным значэнням многіх прыметнікаў уласцівы такія прыметы, якія не могуць адносіцца ці, дакладней, характарызаваць дзеянне, бо прыметы, што абазначаюцца словамі *вальнадумны, віхрасты, кульгавы, лупаты, цыбаты* і пад. уласцівы толькі чалавеку ці жывёле і пры ўсім гэтым не абумоўлены іх дзейнасцю, паводзінамі, учынкамі. Тое ж можна сказаць і пра шэраг прыметнікаў, якія характарызуюць прадметы: *вязкі, гнілы, драхлы, друзлы, закарэлы, запалы, зацяжны, клейкі, убогі* і пад., бо дзеянне не можа быць вязкім, гнілым, драхлым.

Як бачым, у значнай частцы выпадкаў немагчымасць утварэння прыслоўяў ад прыметнікаў абумоўлена самой прыродай з'яў, якія характарызуюцца прыслоўямі, гэта значыць, атрымлівае тлумачэнне на дэнататыўным узроўні.

[1] Гл.: К л ы ч к о в Г. С. // Вестн. МГУ. Сер. истор.-филолог. 1958. № 2.

[2] Гл.: Граматыка беларускай мовы. Мн., 1962. Т. 1. С. 162; 419—420; Беларуская граматыка. Мн., 1985. Ч. 1. С. 105 і наст.; 196—197.

[3] Гл.: К о л ш а н с к и й Г. В. Соотношение субъективных и объективных факторов в языке. М., 1975. С. 102—103; С о л н ц е в В. М. Язык как системно-структурное образование. М., 1971. С. 302—303.

Т. Р. РАМЗА

## БЕЗАСАБОВЫЯ СКАЗЫ І ІХ АДМЕТНЫЯ АДЗНАКІ

Праблема безасабовых сказаў з'яўляецца адной з найбольш спрэчных у сінтаксічнай навуцы. Гэта тлумачыцца тым, што сінтаксічная асоба — комплексная катэгорыя, якая ахоплівае адначасова розныя ўзроўні сказа, а таксама тым, што размежаванне аднасастаўных і двухсастаўных сказаў не мае адназначнага рашэння.

Ужыванне безасабовых сказаў, шматлікасць і своеасаблівасць іх тыпаў даўно прыцягваюць увагу даследчыкаў. Гісторыя вывучэння гэтых сказаў у лінгвістычнай літаратуры багатая і плённая. Разам з тым і ў агульнай інтэрпрэтацыі прыроды безасабовасці і ў класіфікацыі безасабовых сказаў, і іх семантычнай характарыстыцы застаюцца спрэчныя, не да канца вырашаныя пытанні.

Як вядома, да безасабовых сказаў адносяцца такія «аднасастаўныя сказы, галоўны член якіх абазначае дзеянне ці стан незалежна ад вытворцы дзеяння (ці носьбіта прыметы)»[1]. Такое азначэнне ахоплівае фактычна толькі адну групу безасабовых сказаў, у якіх граматычным цэнтрам выступаюць уласна безасабовыя дзеясловы ці безасабова-прэдыкатыўныя словы, якія абазначаюць стан акаляючага асяроддзя. Пэўныя групы сказаў, што ўваходзяць у разрад безасабовых, абазначаюць стан ці прымету, якія ўвогуле не асэнсоўваюцца ў адрыве ад суб'екта — іх носьбіта. Назва «безасабовыя» дадзена сказам такога тыпу на падставе структурных прымет: гэта аднасастаўныя сказы, якія не маюць і не могуць мець незалежнага назоўнага склону імя ў ролі дзейніка. Паводле ж значэння яны заўсёды асабовыя, паколькі заўсёды абазначаюць душэўны стан якой-небудзь асобы.

Існуюць характарыстыкі безасабовых сказаў, якія абапіраюцца на іх граматычныя асаблівасці ці на канкрэтызацыю значэння і граматычных якасцей іх галоўнага члена, але ж асноўным паказчыкам безасабовых сказаў з'яўляецца немагчымасць абазначэння суб'екта дзеяння ў форме назоўнага склону; таму найбольш карэктным уяўляецца азначэнне Н. С. Валгінай: «Безасабовымі называюцца аднасастаўныя сказы, галоўны член якіх не дапускае абазначэння суб'екта дзеяння ў форме назоўнага склону і называюць працэс ці стан незалежна ад актыўнага дзеяча»[2].

Прывядзем яшчэ і дэфініцыю безасабовых сказаў А. М. Гвараздзёва, каб на аснове яе акрэсліць некалькі спрэчных пытанняў, якія існуюць у цяперашні час у вывучэнні безасабовых сказаў: «Безасабовы сказ характарызуецца адсутнасцю дзейніка, які ўвогуле немагчыма ўявіць, і наяўнасцю галоўнага члена, адпаведнага выказніку, але адрознага ад яго тым, што ён не падпарадкаваны дзейніку; такі галоўны член выражаецца ў формах 3-й асобы адзіночнага ліку дзеясловаў, а таксама ў ніякім родзе адзіночнага ліку і ў нязменных словах. (Часам пры маўленні ў якасці няпэўна абазначанага дзеяча ўжываецца слова *яно*, якое адпавядае нямецкаму es і французскаму il у безасабовых сказах)»[3]. Пры параўнанні прыведзенага азначэння і меркаванняў іншых лінгвістаў выяўляюцца такія пытанні: Што стварае прэдыкатыўны цэнтр безаса-